УДК 392.51(476.2-37Гомель)

**Т. В. Глякава**
***Навук. кір. – А. А. Кастрыца, канд. філал. навук, дацэнт***

# ВЯСЕЛЛЕ Ў ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ

У артыкуле разглядаецца вясельная традыцыя Гомельскага раёна. Аўтар звяртаецца да некаторых этапаў вяселля (сватання, заручын, пасада, каравайнай часткі, першага і другога дня вяселля, «пярэзваў», «разгрэбін», «гарэлых пірагоў» і некат. інш.), гаворыць аб тыповым агульнабеларускім характары вяселля і спецыфічных лакальных праявах бытавання вясельнай традыцыі Гомельскага раёна.

Вяселле з’яўляецца выдатным узорам бытавання агульнаэтнічнага фальклору і яго ўзаемаадносін з рэгіянальнай фальклорнай традыцыяй. Так, ва ўсіх рэгіёнах Беларусі традыцыйнае вяселле складаецца са сватання, заручын, зборнай суботы, пасада, каравая, вясельнага застолля і паслявясельнай часткі, аднак усе гэтыя абрадавыя дзеянні адрозніваюцца мясцовай спецыфікай у кожным канкрэтным рэгіёне.

Паводле экспедыцыйных запісаў, зробленых на тэрыторыі Гомельскага р-на, «*...у сваты* ішлі бацька, маці і сват. Ішлі ўвечары, з сабой неслі бохан хлеба, соль у рушніку і гарэлку» [1, с. 161], «хросная матка і хросны бацька бралі хлеб з соллю і графін... Ну, прыходзілі к нявесце з жаніхом» [2, с. 177], «...прыходзілі два дзядзькі яго, матка, хросны яго» (в. Рудня-Марымонава). Па сутнасці, працэс сватання нагадваў гандаль, мэта якога – дамовіцца аб шлюбе: «Адзін з сватоў кажа: “Вось вам хлеб ды соль, а нам давайце тавар”. Але бацькі мае сказалі пачакаць, адразу паехалі рабіць агляд гаспадаркі маладога. Далей далі згоду на шлюб, аставіўшы прывезены хлеб» (в. Рудня-Марымонава).

Калі бацькі згаджаліся на шлюб, адбываліся *заручыны*: «Заручыны адбываліся пры вялікай прысутнасці гасцей. Гуляюць заручыны паасобку – нявеста сабе, жаніх сабе. ...На заручынах дамаўляліся аб дні правядзення вясельнага застолля» [2, с. 161]. Яшчэ на заручынах бацькі дамаўляліся аб усіх падрабязнасцях вяселля, а маладыя аб- меньваліся пярсцёнкамі. Цікавай асаблівасцю в. Рудня-Марымонава быў вось які звычай: «Калі на заручынах прысутнічае стары халасцяк, то яму прывязуюць ступу і прымушаюць у наказанне цягаць ступу за тое, што ён доўга не жэніцца».

На заручынах спявалі розныя песні. Вось якую прыгадала жыхарка в. Рудня-Марымонава Маёрава Е. І., 1934 г. н.:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Звянчалі Ганначку сілаю.*
*Не дарма яе звянчалі,*
*Звянчалі яе за грошы,*
*Што яе Данілка харошый.*
*Ехала Ганначка ад вянца*
*Да й забылася грабянца.*
*Упаў грабянец пад сталец.*
*– Падай, Данілка, грабянец!*
*– Я табе, Ганулька не маладзец,*
*Каб падаць табе грабянец,*
*Няхай падаюць дружачкі-служачкі.*

Па словах жыхаркі в. Глыбокае Крукавай Т. І., «перад вяселлем *дзеўкі завівалі велца*. Гэта значыць, бралі маладую ёлачку або сасёнку. Ставілі яе ў вялікі бохан хлеба, каб не падала. Потым навешвалі на яе розныя ўпрыгожванні: бумажныя кветкі, стужкі, цукеркі, баранкі. Гэта каб маладыя былі багатыя». Гэтую «ёлку-вянец» «жаніх абязаны выкупіць у дзяўчат. ...Еслі дзевушкі сахраняюць вяршыну ёлкі (крыж з бумагі), то жаніх плаціць даражэй. З гэтай ёлкай вязуць маладую да жаніха» [2, с. 161]. Усе гэтыя дзеянні з «вянцом» былі напоўнены глыбокім маральна-этычным падтэкстам і сімвалізавалі дзявочую чысціню, маладосць.

Наступная неад’емная частка беларускага традыцыйнага вясел- ля – *пасад*, які быў своеасаблівай формай благаслаўлення на шлюб мала- дых. Іх садзілі на хлебную дзяжу: «У нявесты расцілаюць кажух для маладых на скамейцы ля кута. Садзяць жаніха і нявесту на гэты кажух для таго, каб багата жылі» (в. Аздзеліна); «Тут у хаце молодого адбываўся посад. Молода залазіла на лаўку перад іконай і тры разы цалавала яе. Потым сястра молодое і брат молодого вядуць іх, саджаюць на лаву, дзе завіваюць. Потым староста (тамада) кажа: “Благаславець, гаспадары, молодых”. А ім отказваюць: “Бог благаславіць”. І так тры разы. Потым ізноў гуляюць, п’юць, пяюць» [1, с. 164].

Адметнасцю вяселля Гомельшчыны з’яўляецца і *каравайны абрад*, павышаная ўвага да рытуалаў падрыхтоўкі і выпечкі якога бы- ла прадыктавана сімволікай хлеба як святыні, шчасця і багацця:
«Матка бегае та гукае каравай пекці тую, которая з мужыком жыве прылічна і штоб не разводная была. І тогды, як учыняюць цеста, спявалі:

*Губатая вчыняла,*
*Ноздратая мясіла,*
*А харошая дай прыгожая*
*Да й у печ пасадзіла.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тогды, як каравай подойдзе, зноў спяваюць:

*Печке рогоче, печка рогоче,*
*Да чого ж яна хоча?*
*А прыпечак заліваецца,*
*А прыпечак заліваецца,*
*Коровою спадзеваецца.*

Коровай спекся, выцеглі еты коровай і ўносяць у комору, у хаце не ставяць» [2, с. 188].

*Вясельнае застолле* было даволі ўрачыстым, а вясельны стол па магчымасці абстаўляўся як мага багацей: «На вяселле гатавалі галубцы, катлеты, халадзец, бліны, піражкі, калі лета, то з градкі бралі: гуркі, памідоры і інш. Варылі кампот, а таксама на стале заўсёды стаяў самагон ці гарэлка» (в. Шарпілаўка). Вось што, напрыклад, прыгадала аб сваім вяселлі жыхарка в. Рудня- Марымонава Маёрава Е. І.: «Мы на свадзьбу сабіралі сваю радню, а жаніх сваю. Яны там гуляюць, у сва-ёй дзярэўні, пагулялі, і прыязджаюць за мной на кані. І выкуп дзелалі ўжо маладой. Выкупалі шампанскім, канфетамі і т. д. Забралі потым маладую. Малады бярэ мяне за руку і вядзе за стол і гасцей тых ужо прывечаюць, якія прыехалі са стараны маладога, мае госці ўступаюць ім сталы. Як выкупілі ўжо мяне і тады свякруха расцілае кажух за сталом і мы садзімся на кажух у красным куце. Свята было да самага вечара, на гармоні йгралі. Свадзьбу мы гулялі сем дзён. Першы дзень у маладой, другі дзень у маладога. Гулялі яшчэ суботу, нядзелю, а ў панядзелак усе ішлі на работу, а пасля чатырох гадзін зноў збіраліся. Перад дзяльбой каравая, нас сажалі ў кут на кажух. ...Каравай дзержалі пара мужчын і рэзалі яго хросная маці і бацька, адзін са сватоў наліваў гарэлку, а другі вызываў бацькоў. За кусок каравая госці давалі маладым падаркі і гаварылі розныя пажаданні: “Дару курачку-нясуху, каб маладая пацалавала свякруху”, “Дарую палена, каб пацалаваў тешчу ў калена”». Адзначым, што «дзяльба каравая – завяршальны этап каравайнага рытуалу беларускага вяселля, менавіта каравая як сакральнага атрыбута шлюбнай абраднасці, а не хлеба наогул, які застаецца адным з міфалагізаваных прадметаў да заканчэння вяселля і нават на паслявясельным этапе» [3, с. 200].

Цікавы вясельны звычай прыгадала інфарматар з в. Шарпілаўка Гардзеенка А. Т.: «Калі маладая ішла к маладому, запальвалі агонь у варотах, праз які павінен быў перапрыгнуць конь. Калі ён гэта рабіў, то вароты адкрывалі».

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Былі ў вёсках Гомельскага раёна і *«пярэзвы»* («...і як начнуць пярэзвы вадзіць, ды водзяць нядзелю ці дзве» (в. Даўгалессе)), і *«разгрэбіны»* («...на разгрэбіны гуляюць у гульні. Пяюць песні, танцуюць», «...гуляюць на пяты дзень. Кладуць вогнішча на дарозе, каля двара. Бяруць з седала курыцу і смаляць яе на вогнішчы. Жарать на вогнішчы сала і яйкі, і пачынаецца каля вогнішча гульня ў "Трыфана"» (в. Рудня-Марымонава)) і *«гарэлыя пірагі»* («Чэраз нядзелю после свадзьбы едуць, напрымер, я сына свайго жаніла, сваха прыгласіла, прыязжайце на "гарэлыя" пірагі» [2, с. 183]). Па словах даследчыка традыцыйнай духоўнай спадчыны Гомельшчыны В. С. Новак, «...пярэсты характар бытавання вясельнай традыцыі, напоўненай у кожным канкрэтным выпадку непаўторным зместам, дазваляе сцвярджаць факт самабытнасці вясельнага жанру ў дачыненні да пэўнага геагра- фічнага раёна» [4, с. 164].

Такім чынам, зробленыя запісы вясельнага абраду і паэзіі ў Гомельскім раёне дазваляюць гаварыць і аб тыповым агульнабеларускім характары вяселля, і аб спецыфічных лакальных праявах бытавання вясельнай традыцыі.

**Спіс літаратуры**


1 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік. / Укладанне, сістэматызацы, тэксталагічная праца, уступны артыкул, рэгадаванне: І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск, ЛМФ "Нёман", 2003. – 472 с.

2 Народная духоўная спадчына Гомельскага раёна / Укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца і рэдагаванне В. С. Новак. – Гомель: ААТ " Полеспечать", 2007. – 456 с.

3 Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік, А. С. Емяльянаў, У. М. Сысоў, М. А. Каладзінскі; навук. рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мн.: Бел навука, 2001. – 422 с.

4 Новак, В. С. Адметнасці вясельнай традыцыі Гомельшчыны / В. С. Новак. – Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы: материалы VII Междунар. науч. конф., Гомель, 26 – 27 мая 2011 г. В 2 ч. Ч. 1 / М-во образования Респ. Беларусь; под общ. ред. В. В. Кириенко. – Гомель: ГГТУ им. П. О. Сухого, 2011. – С. 164–166.


* Выкарыстаны матэрыял фальклорнага архіва кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ